

# Эстэтычнае выхаванне малодшых школьнікаў

*Комплексна-мэтавая праграма*

*Праграма "Эстэтычнае выхаванне малодшых школьнікаў" скіравана на паўнацэннае фарміраванне і развіццё асобы і складаецца з наступных раздзелаў:*
1. *Мэта і задачы эстэтычнага выхавання малодшых школьнікаў.*
2. *Прырода як сродак эстэтычнага выхавання асобы.*
3. *Мастацтва як сродак эстэтычнага выхавання.*
4. *Мастацкая творчасць як істотны аспект эстэтычнага выхавання малодшых школьнікаў.*

### Мэта і задачы эстэтычнага выхавання

Фарміраванне сацыяльна адаптаванай асобы, прыдатнай да стваральнай творчай дзейнасці, — адна з важнейшых задач сучаснай школы. У апошні час працэс развіцця творчай сферы асобы разглядаецца як фарміраванне ў вучняў эстэтычных адносін да жыцця, вышэйшай праявай якога выступае стваральная творчасць чалавека сродкамі прыроды, мастацтва, духоўных зносін выхавальніка і выхаванца. Узровень жа эстэтычных адносін да жыцця вызначаецца ўзроўнем развіцця кампанентаў эстэтычнай свядомасці (успрымання, пачуцця, густу, інтарэсаў і г. д.), развіццё якіх адбываецца праз назапашванне эстэтычных ўражанняў і вопыту. Эстэтычныя перажыванні, набыты вопыт, увасабляючыся ў актыўнай творчай дзейнасці, садзейнічаюць максімальнай рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы. Развіццё эмацыянальнай сферы і творчага патэнцыялу найбольш эфектыўна адбываецца ў працэсе мастацкай творчай дзейнасці, таму асноўнымі задачамі эстэтычнага выхавання дзяцей малодшага школьнага ўзросту з'яўляюцца:

- развіццё эмацыянальнай сферы асобы ў працэсе ўспрымання прыроды, мастацтва і мастацка-творчай самарэалізацыі вучня;
- развіццё творчай актыўнасці школьніка і стымуляванне цікавасці да мастацтва;
- фарміраванне неабходнага мінімуму мастацтвазнаўчых і мастацкіх ведаў для ўдасканальвання ўменняў і назапашвання эмацыянальна-эстэтычнага вопыту;
- фарміраванне эстэтычных адносін да жыцця праз актуалізацыю эстэтычных перажыванняў пры стварэнні вобраза ў мастацкай творчай дзейнасці;
- стварэнне неабходных умоў для творчага праяўлення асобы.

### Прырода як сродак эстэтычнага выхавання

Першаасновай у фарміраванні эстэтычнага ўспрымання вучняў увогуле з'яўляецца эстэтычнае ўспрыманне прыроды. Аднак прырода не адразу раскрывае перад чалавекам сваю прыгажосць. Успрыманне прыгожага — гэта вынік працяглых напружаных намаганняў, пэўнага ўзроўню развіцця эмацыянальнай сферы, ведаў, трэніраванасці органаў пачуццяў чалавека. Вось чаму развіваць эстэтычнае ўспрыманне прыроды трэба паступова, ускладняючы заданні і ўлічваючы ўзроставыя асаблівасці дзяцей.

Эстэтычнае ўспрыманне навакольнага асяроддзя садзейнічае разуменню мастацтва, развіццю мыслення, мовы, самастойнасці разважанняў, пашырэнню кругагляду вучняў. Азнаямленне са светам прыроды павінна прыносіць дзецям эстэтычную асалоду, быць неназойлівым, нетаропкім і нагадваць свята. Да задач, якія вырашаюцца ў працэсе азнаямлення вучняў з прыродай, адносяцца:

- абуджэнне цікавасці да прыроды, стымуляванне імкнення да пазнання і эмацыянальнай чуласці;
- развіццё ўвагі да з'яў навакольнага асяроддзя, уменне іх асэнсоўваць;
- фарміраванне эмацыянальнай сферы дзіцяці праз зносіны з прыродай;
- развіццё ў школьнікаў здольнасці бачыць і ўспрымаць прыгожае.

Эфектыўнымі формамі работы па азнаямленню школьнікаў з прыродай з'яўляюцца прагулкі, экскурсіі, турысцкія паходы. У час правядзення такіх мерапрыемстваў праяўляюцца маральныя, валявыя, фізічныя якасці дзяцей, у іх развіваюцца фантазія, творчае ўяўленне, многія вучні пачынаюць заўважаць прыгажосць у мудрагелістых контурах дрэў, кустоўя, камянёў і г. д., у іх з'яўляецца цікавасць да з'яў прыроды, узрастае ўвага, фарміруецца эстэтычнае ўспрыманне.

Экскурсіі — найлепшы спосаб азнаямлення дзяцей з прыродай. Тэматыка і мэты экскурсій могуць быць разнастайнымі, аднак форма іх правядзення заўсёды нязменная — гульнёвая. Напрыклад, пад час назіранняў за пэўнымі раслінамі настаўнік падзяляе дзяцей на групы, кожнай з якіх паказвае расліну і прапануе знайсці такую ж на полі (лузе, у парку і г. д.). Знойдзеныя вучнямі расліны разглядваюцца, узгадваюцца іх лекавыя якасці, называюцца адметныя асаблівасці. Дзеці загадваюць загадкі, расказваюць легенды і паданні пра гэтыя расліны. Праводзяцца гульні "Пазнай па апісанню", "Пазнай па паху", "Пазнай навобмацак", "Назаві ўмовы пражывання", "Назаві насякомых — сяброў раслін" і г. д.

Настаўнік, рыхтуючыся да экскурсіі, павінен падабраць карысны і займальны матэрыял аб прадстаўніках жывёльнага свету таго месца, дзе праходзіць экскурсія.

Малодшыя школьнікі з вялікім задавальненнем заўсёды назіраюць за насякомымі, уважліва слухаюць інфармацыю аб іх жыццядзейнасці, асаблівасцях.

Пры назіранні за мурашамі, напрыклад, настаўнік можа расказаць, што адна мурашыная калонія на працягу сезона знішчае да 700 тысяч розных шкодных насякомых, адзін мураш засцерагае ад шкоднікаў каля 0,2 га лесу. Вось чаму лесаводы не толькі ахоўваюць гэтых насякомых, але і павялічваюць лік мурашнікаў шляхам іх дзялення і стварэння ўмоў, спрыяльных для размнажэння.

Мурашы — добрыя прадказальнікі надвор'я. Перад вялікім ліўнем яны старанна закрываюць хады, якія вядуць у мурашнік; перад цёплай зімой устройваюць зімовыя спальні пад каранямі дрэў або пнёў, калі ж зіма абяцае быць суровай, яны забіраюцца ў глебу.

Мурашыны спірт выкарыстоўваецца пры лячэнні рэўматычных захворванняў, мурашыная кіслата засцерагае ад камароў. Калі ў час прагулкі па лесе дакучаюць камары, трэба пакласці на некалькі хвілін у мурашнік насоўку і абцерці ёю твар і рукі.

Перад правядзеннем экскурсіі неабходна засяродзіць увагу дзяцей на правілах паводзін на прыродзе, беражлівых адносінах да яе. Вынікі экскурсіі можна падвесці праз пэўны прамежак часу ў гульнёвай форме "Што мы бачылі на экскурсіі" з выкарыстаннем літаратурных, музычных твораў і твораў выяўленчага мастацтва.

Пры разглядванні твораў выяўленчага мастацтва, слуханні музыкі суадносяцца назіранні за прыродай і яе выяўленне ў жывапісе, музыцы; на канкрэтных прыкладах паказваецца, як мастакі і кампазітары адлюстроўваюць аналагічныя назіранні ў творах.

Выкананне школьнікамі творчых заданняў прывучае іх да самастойнасці, сістэматызуе атрыманыя веды, павышае цікавасць да навакольнага свету, дапамагае аналізаваць з'явы, якія назіраюцца, рабіць вывады і абагульненні, г. зн. разумець і любіць прыроду.

Калектыўныя практычныя справы дапамагаюць вучням зразумець важнасць і неабходнасць клопату аб прыродзе, усвядоміць сваю ролю ў справе абароны і захавання навакольнага асяроддзя, павышаюць асабістую адказнасць кожнага з іх за стан прыроды, садзейнічаюць фарміраванню экалагічных ведаў.

Гульні развіваюць мысленне, уяўленне, творчую актыўнасць дзяцей, фарміруюць эстэтычнае ўспрыманне прыроды і ўстойлівыя эстэтычныя адносіны да яе. Напрыклад:

**Казачныя гарады.**

***Абсталяванне:*** выявы казачных домікаў, садавіны (агародніны, грыбоў, рыб).

Вядучы прапануе вучням прыдумаць назвы вуліц у казачным фруктовым (рыбным, грыбным і г. д.) горадзе. У фруктовым горадзе назвы вуліц будуць паходзіць ад назваў фруктаў, у рыбным — ад назваў рыб і г. д.

**Збяры суседзяў.**

***Абсталяванне:*** выявы казачнага лесу (мора, саду, агароду).

Вядучы называе звера (рыбу, птушку і г. д.), вучань пералічвае звяроў, якія жывуць з дадзеным зверам у адных кліматычных умовах.

**Угадай расліну.**

***Абсталяванне:*** пакаёвыя расліны ці іх выявы.

Вядучы выстаўляе вазоны з кветкамі, вучні называюць іх. Узгадваюцца правілы догляду пакаёвых раслін. Затым вядучы апісвае адну з кветак, вучні называюць яе. Потым кветкі апісваюць вучні, а вядучы называе іх.

Вазоны можна памяняць месцамі і прапанаваць дзецям назваць кветку, якая пакінула сваё месца. Гульня мае шмат варыянтаў: "Угадай звера (птушку, насякомае, рыбу і інш.)".

**Загадай загадку.**

***Абсталяванне:*** выявы птушак (раслін, рыб, звяроў, садавіны, агародніны, рэчаў і г. д.).

Вучні ўзгадваюць загадкі на зададзеную тэму, затым прыдумваюць іх самі.

**Прыдумай казку.**

***Абсталяванне:*** ілюстрацыі да казкі С. Маршака "Дванаццаць месяцаў", малюнкі з адлюстраваннем зімы, вясны, лета, восені.

Выконваецца гульнёвае заданне "Калі гэта бывае". Вядучы задае пытанні тыпу: калі расцвітаюць пралескі? Калі замярзаюць рэкі? Калі птушкі адлятаюць у вырай? Калі збіраюць ураджай садавіны і агародніны? І г. д. Вучні адказваюць на пытанні. Узгадваецца змест казкі С. Маршака "Дванаццаць месяцаў". Затым дзеці змяняюць сюжэт казкі, прыдумваючы свой варыянт просьбы, з якой дзяўчынка звярнулася б да дванаццаці месяцаў, і што з гэтага атрымалася.

**Чый слупок вышэй.**

***Абсталяванне:*** карткі па колькасці груп, на якіх запісаны склады, напрыклад:

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| лі | са<br>тара<br>мон<br>нія<br>па | ка | рова<br>за<br>чан<br>вун<br>са | ма | ліна<br>шына<br>ндарын<br>ра<br>мант |

Вучні дзеляцца на тры групы, атрымліваюць карткі. Яны павінны скласці словы, прыдумаць новыя і запісаць іх.

Эфектыўным сродкам эстэтычнага выхавання дзяцей малодшага школьнага ўзросту з'яўляюцца і такія формы работы:

збор калекцый, арганізацыя выстаў і правядзенне гутарак на іх падставе. Вучні збіраюць паштоўкі на розныя тэмы (расліны, птушкі, дрэвы, кветкі і г. д.), арганізуюць выставы — фотамантажы пад назвамі "Поры года", "Дзіўнае ў небе", "Фантастычны лес" і да т. п.;

віктарыны, якія ўключаюць займальныя пытанні, загадкі, рэбусы, пытанні-жарты, крыжаванкі, шарады і г. д., выконваюць развіццёвыя, дыдактычныя і займальныя функцыі;

вусны часопіс — форма работы, якая адкрывае малодшым школьнікам шырокія магчымасці для азнаямлення з навакольным светам і развіцця творчага патэнцыялу. Дзеці выбіраюць назву часопіса, рубрык, галоўнага рэдактара, шукаюць літаратурныя і музычныя матэрыялы. Часопіс можна праводзіць у гульнёвай форме.

Святы і фестывалі — комплексныя формы арганізацыі дзейнасці вучняў, якія адрозніваюцца разнастайнасцю тэматыкі, напрыклад: "Фарбы лета", "Залатая восень", "Жыццё пад снегам", "Дзень снегавікоў", "Вясна-красна", "Крылатыя сябры", "Чароўныя гукі лесу" і т. п. Правядзенне свят і фестываляў патрабуе працяглай падрыхтоўкі, таму яны адбываюцца 1 — 2 разы ў год.

**В. Г. КУХАРОНАК,**
**кандыдат педагагічных навук.**
**г. Мінск.**

*(Заканчэнне будзе)*